# Нашы юбіляры



## Андрэй Аляксандравіч ГАРБАЦКІ

## Andrej Aleksandrovich GORBACKIJ

Споўнілася 60 гадоў выдатнаму беларускаму гісторыку, доктару гістарычных навук, прафесару Андрэю Аляксандравічу Гарбацкаму. Многія гады ён працуе ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна, аднак час навучання, навуковыя і проста чалавечыя сувязі родняць яго з Беларускім дзяржаўным універсітэтам.

А. А. Гарбацкі нарадзіўся 22 сакавіка 1956 г. у в. Віўнева Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Пасля заканчэння мясцовай васьмігадовай школы вучыўся ў Брэсцкім прафесійна-тэхнічным вучылішчы чыгуначнага транспарту, служыў у арміі. У 1982 г. скончыў гістарычны факультэт, а ў 1987 г. - аспірантуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У гады навучання праявілася актыўная грамадская пазіцыя Андрэя Аляксандравіча, яго добрыя арганізацыйныя здольнасці. Ён узначальваў студэнцкія арганізацыі факультэта, орган самакіравання аспіранцкага інтэрната. Быў майстрам вядомага будаўнічага атрада «Октябрь», які выязджаў на будаўніцтва беларускай станцыі Залацінка на Байкала-Амурскай магістралі.

У 1988 г. А. А. Гарбацкі абараніў кандыдацкую дысертацыю. Працаваў у Брэсцкім педагагічным інстытуце і займаўся навуковай працай. Прадоўжыў павышэнне навуковай кваліфікацыі ў дактарантуры Інстытута гісторыі НАН Беларусі (1996-1999). У 1999 г. абараніў дысертацыю на саісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук па тэме «Стараабрадніцтва на Беларусі ў канцы XVII - пачатку XX ст.». Працаваў прафесарам кафедры гісторыі культуры і рэлігіі, у 2003-2005 гг. - прарэктарам па навуковай рабоце, першым прарэктарам Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна, з 2006 г. - прафесар кафедры гісторыі славянскіх народаў.

Сёння А. А. Гарбацкі - вядомы ў Беларусі і за яе межамі даследчык. Ён упершыню звярнуўся да гісторыі стараабрадніцтва на беларускіх землях, падрыхтаваў па гэтай навуковай праблеме дзве манаграфіі («Стараабрадніцтва на Беларусі ў канцы XVII - пачатку XX ст.» (1999); «Старообрядчество на белорусских землях» (2004)), якія атрымалі высокую ацэнку навуковай супольнасці, а таксама ўнікальны фотаальбом «Старообрядческие храмы Беларуси» (2008).

А. А. Гарбацкі - аўтар звыш 145 навуковых і вучэбна-метадычных публікацый, якія выходзілі

ў Беларусі, Полыпчы, Латвіі і іншых краінах. Сфера яго прафесійных інтарэсаў надзвычай шырокая. Гэта гісторыя Беларусі, гісторыя рэлігій, сацыяльна-культурная антрапалогія, антрапалогія паўсядзённасці, сацыяльна-эканамічныя і культурныя працэсы на пагранiччы. У апошнія гады А. А. Гарбацкі надзвычай плённа працуе ў галіне сацыяльна-культурнай антрапалогіі, вельмі многія яго работы прысвечаны праблеме культурнага пагранічча, малой радзімы. Ён з'яўляецца кіраўніком Цэнтра даследавання пагранічча Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі сістэмна акрэсліў праблему малой радзімы. Зыходзячы з асаблівасцей культурнага пагранічча, даў ёй вызначэнне. Аўтар шэрагу навуковых праектаў, прысвечаных роднаму рэгіёну, жія атрымалі вядомасць у Беларусі і за яе межамі. Перш за ўсё гэта праекты «Гарады і раёны Берасцейшчыны: гісторыя і сучаснасць. Івацэвіцкі раён» (2007-2009), «Гарады і раёны Берасцейшчыны: гісторыя і сучаснасць. Іванаўскі раён» (2013-2014). Цяпер рэалізуецца чарговы праект - «Гарады і раёны Берасцейшчыны: гісторыя і сучаснасць. Маларыцкі раён». Па выніках вывучэння гісторыі і культуры Івацэвіцкага раёна пад кіраўніцтвам А. А. Гарбацкага выдадзена грунтоўная калектыўная манаграфія. Да друку рыхтуюцца выданні па гісторыі Іванаўскага і Маларыцкага раёнаў. У 2011 г. А. А. Гарбацкі выдаў манаграфію «Православные монастыри Беларуси: история и современность. Чонский монастырь» (2011).

А. А. Гарбацкі падтрымлівае навуковыя кантакты з даследчыкамі з Украіны, Полынчы, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Расіі, Германіі, ЗША. Выступаў з дакладамі на многіх навуковых форумах. Неаднаразова запрашаўся для чытання лекцый ва ўніверсітэты Полынчы і Грэцыі. Выступав як ініцыятар і адзін з арганізатараў перыядычнай Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Праваслаўе ў духоўным жыцці Беларусі». Уваходзіць у склад рэдакцыйных саветаў навуковых часопісаў «Гістарычная брама» (Палескі дзяржаўны ўніверсітэт), «Судьба старообрядчества» (г. Кіеў), «Edukacja Mi^dzykulturowa» (г. Катавіцы, Польшча), шмат гадоў з'яўляецца адказным рэдактарам «Весніка Брэсцкага ўніверсітэта» (Сер. 2: Гісторыя. Эканоміка. Права).

Андрэй Аляксандравіч паспяхова кіруе дысертацыйнымі даследаваннямі сваіх аспірантаў, часта яго запрашаюць у якасці эксперта ці афіцыйнага апанента пры абмеркаванні і абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. А. А. Гарбацкі ўваходзіць у склад савета па абароне дысертацый пры Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Шмат увагі ён надае працы з маладымі вучонымі, аказвае ім вялікую навукова-метадычную дапамогу. Як выкладчыка, прафесара А. А. Гарбацкага вылучаюць патрабавальнасць, дысцыплінаванасць і адначасова справядлівасць, спагадлівасць, тактоўнасць. Яго лекцыйныя і семінарскія заняткі вызначаюцца наватарскімі падыходамі, выкарыстаннем перадавых педагагічных тэхналогій. Ім падрыхтаваны шэраг аўтарскіх навучальных дапаможнікаў, сярод іх: «Введение в историю религии» (з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 2005), курс лекцый у 2 частках «Христианство» (2008, 2010) і інш.

За шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць, значны асабісты уклад у развіццё навуковых даследаванняў, укараненне іх у вучэбны працэс, падрыхтоўку навуковых кадраў А. А. Гарбацкі неаднаразова ўзнагароджваўся граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Яго плённая культурна-асветніцкая дзейнасць адзначана граматай епіскапа Брэсцкага і Кобрынскага Іаана. А. А. Гарбацкі з'яўляецца папулярызатарам беларускай культуры і прыроды на радзіме і за яе межамі. У 2010 г. арганізаваў персанальную фотавыстаўку пад назвай «Які прыгожы гэты свет». Вялікі ўклад робіць Андрэй Аляксандравіч і ў арганізацыю турызму ў краіне. У 2005 г. сумесна з прафесарам Я. М. Мяшэчкам падрыхтаваў навукова-папулярнае выданне «Беларускае Палессе. Турыстычныя транс'еўрапейскія водныя магістралі». Кніга выйшла на трох мовах - рускай, польскай і англійскай. Болынасць фотаздымкаў, змешчаных у ёй, зроблены асабіста А. А. Гарбацкім.

Узважваючы навуковы ўклад Андрэя Аляксандравіча, яго высокі прафесіяналізм як выкладчыка, годнасць і патрабавальнасць як эксперта і кіраўніка дысертацыйных даследаванняў, тактоўнасць, добразычлівасць і канструктывізм як гісторыка і чалавека, хочам пажадаць прафесару А. А. Гарбацкаму далейшых поспехаў, здзяйснення творчых і навуковых планаў.

***А. Г. Каханоўскі,***
доктар гістарычных навук, дацэнт,
загадчык кафедры гісторыі Беларусі
новага і навейшага часу БДУ